**Даведка пра перспектывы распрацоўкі і ўсталявання інфармацыйных шыльдаў у гістарычным цэнтры г. Гродна**

Гродна – адзін з багацейшых на гістарычную спадчыну гарадоў Беларусі. У ім захаваліся помнікі розных архітэктурных стыляў (готыка, рэнесанс, барока, класіцызм, эклектыка і інш.). Гродна наведвалі і жылі ў ім многія вядомыя асобы, у тым ліку вялікі князь Вітаўт, каралі Стэфан Баторы і Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. З гісторыяй горада звязаны барацьба з крыжакамі, падзелы Рэчы Паспалітай і іншыя гістарычныя падзеі еўрапейскага маштаба.

У лютым 2010 г. было падпісана беларуска-польскае пагадненне аб малым прыгранічным руху. Пасля яго ратыфікацыі жыхары прыгранічных тэрыторый атрымаюць магчымасць перасякаць мяжу без візы з мэтай культурных, грамадскіх альбо сямейных кантактаў. Гродна, як і шэраг іншых населеных пунктаў, увайшоў у акрэсленую пагадненнем тэрыторыю. Гэта азначае, што пасля ўвядзення ў дзеянне пастановы, пры наяўнасці належнай інфраструктуры колькасць турыстаў у горадзе можа павялічыцца.

Развіццё турыстычнай інфраструктуры сучаснага Гродна нельга ўявіць без выкарыстання інфармацыі пра мінулае горада. Турысты, якія наведваюць Гродна, а таксама жыхары нашага горада сёння маюць магчымасць набыць паштоўкі, фотаальбомы, кнігі пра Гродна, яго гісторыю і сучаснасць. Аднак падчас вандровак па гораду ў турыста няма магчымасці атрымаць дадатковую інфармацыю пра помнікі архітэктуры і гісторыі горада таму, што на будынках усталяваны толькі ахоўныя шыльды з датай іх пабудовы. Вуліцы у гістарычным цэнтры горада таксама маюць працяглую гісторыю, якая была адлюстравана ў іх першапачатковых назвах, але гэтыя звесткі можна атрымаць толькі ад экскурсавода ці ў спецыяльнай літаратуры, бо за два апошнія стагоддзі назвы вуліц неаднаразова змяняліся.

Размяшчэнне ў гістарычным цэнтры горада разнастайных шыльдаў з цікавай гістарычнай інфармацыяй дапаможа турысту адчуць атмасферу мінулага горада, даведацца больш пра яго гісторыю, адшукаць дарогу да важных культурных аб’ектаў, заахвоціць яго да больш грунтоўнага азнаямлення з горадам. Усё гэта зробіць побыт турыста ў Гродна больш камфортным і заахвоціць наведаць наш горад яшчэ не адзін раз.

Гарадскімі уладамі ў межах п. 3.5. Гарадской праграмы “Спадчына” на перыяд 2006-2010 гг. запланаваны мерапрыемствы па інфармацыйна-турыстычным аздабленні гістарычнага цэнтра горада і аб’ектаў гісторыка гультурнай спадчыны. У адпаведнсці з гэтымі планамі, а таксама для аптымальнага выкарыстання турыстычнага патэнцыяла горада, прапануем разгледзець магчымасць распрацоўкі і ўсталявання наступных катэгорый шыльдаў з гістарычнымі даведкамі:

**Першая катэгорыя – шыльды каля гістарычных помнікаў**. На іх будуць змешчаны наступныя звесткі: дата пабудовы, архітэктурны стыль, заснавальнікі (фундатары), архітэктары (калі вядома, імя і прозвішча), асноўныя падзеі ў гісторыі будынка ад заснавання да сённяшняга дня, а

таксама цікавыя выявы помніка, якія паходзяць з мінулага. Усталёўваюцца непасрэдна каля помнікаў. Прыклад тэксту шыльды пра Прачысцінскую царкву і Свята-Раства-Багародзіцкі жаночы праваслаўны манастыр змешчаны ў дадатку 1.

*Помнікі, каля якіх прапаноўваецца ўсталяваць шыльды*: царква Св. Барыса і Глеба (Каложская царква, вул. Рыбацкая, 6/1), Ніжняя царква (на тэрыторыі Старога замка), Стары замак (вул. Замкавая, 22), Новы замак (вул. Замкавая, 20), касцёл Знаходкі Святога Крыжа і бернардзінскі кляштар (вул. Парыжскай камуны, 1), Фарны касцёл і былы езуіцкі кляштар (вул. Кірава, 1), месца Фары Вітаўта (раён пл. Савецкай і вул. Замкавай), касцёл Маці Божай Анёльскай і францысканскі кляштар (вул. Агародная, 2), касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Панны Марыі і брыгіцкі кляштар (званіца) (вул. К. Маркса, 29), Прачысцінская царква, царква Раства Багародзіцы і манастыр (вул. Давыда Гарадзенскага, 3), Кармеліцкі касцёл і кляштар (зараз будынак ААТ "Прыёрбанк", вул. Маставая, 37), Святапакроўскі Сабор (вул. Ажэшкі, 23), Уладзіміраўская царква (вул. Перамогі, 5), касцёл і кляштар бернардзінак (на месцы Абласнога драматычнага тэатра, вул. Маставая, 35), каралеўскія рэзідэнцыі Станіслававa (вул. Церашковай, 29), Аўгустова (раён вул. Рэпіна, 2), Панямунь (вул. Панямуньская, 19).

Прапанаваныя шыльды могуць быць аб'яднаныя ў некалькі тэматычных турыстычных маршрутаў (напрыклад, "Гарадзенская архітэктурная школа", "Каталіцкія храмы Гродна", "Шляхам апошняга караля Рэчы Паспалітай").

**Другая катэгорыя – шыльды, прысвечаныя гісторыі вуліц ці плошчаў.** Гэтыя шыльды прапануецца ўсталяваць на пачатку вуліц/на плошчах. На іх будуць змешчаны наступныя звесткі: першая дата згадкі вуліцы/плошчы, якія пабудовы на ёй былі, якія захаваліся зараз, хто пражываў, асноўныя падзеі, звязаныя з гісторыяй вуліцы/плошчы, якія назвы мела вуліца/плошча ў мінулым, схема вуліцы. Прыклад тэксту шыльды па Савецкай вуліцы змешчаны ў дадатку 2. Некаторыя прыклады шыльдаў, якія ўжо ёсць на вуліцах Магілёва, Баранавіч, Варшавы, змешчаны ў дадатку 3.

*Вуліцы і плошчы, на якіх прапануецца ўсталяваць шыльды*: вуліцы Маркса, Кірава, Урыцкага, Кастрычніцкая, Сацыялістычная, Свердлава, Камсамольская, Парыжскай Камуны, Савецкая, Ажэшкі, Вялікая Траецкая, Горкага, Дзяржынскага, 1 мая, Гараднічанская, 17 верасня, Калючынская, Карбышава, Васілька, Замкавая, Давыда Гарадзенскага, Баторыя, Падольная; плошчы Савецкая і Тызенгаўза; Парк Жылібера.

**Трэцяя катэгорыя – шыльды з выявамі прац знакамітага мастака Напалеона Орды.** Іх прапануецца ўсталяваць у тых месцах, адкуль мастак маляваў Гродна ў 1860-х гг. Наведвальнікі горада будуць мець цікавую магчымасць непасрэдна на мясцовасці агледзець не толькі сучасны горад, але

і тое, што яны пабачылі б тут амаль 150 гадоў таму! Прыклады выяў для такіх шыльдаў, а таксама месцаў, дзе яны могуць быць усталяваны, прадстаўлены ў дадатку 4.

Інфармацыя для гістарычных даведак, якія будуць змешчаны на прапануемых шыльдах, будзе рыхтавацца на падставе архіўных і друкаваных крыніц, а таксама айчыннай і замежнай літаратуры.

Прапанаваны падыход да развіцця інфармцыйна-турыстычнага патэнцыяла Гродна базуецца на досведзе замежных краін, у тым ліку Польшчы (Кракаў, Люблін, Варшава), Украіны (Львоў) і Літвы (Вільнюс). З 2009 года існуе магчымасць выкарыстання магчымасцяў Праграм Еўрапейскага саюза ў гліне транспамежнага супрацоўніцтва "Польшча-Украіна-Беларусь" і "Латвія-Літва-Беларусь" для тэхнічнай і фінансавай падтрымкі рэалізацыі падобнай праграмы ў нашым горадзе.

*Даведку падрыхтавалі:*
*Наталля Сліж, кандыдат гістарычных навук,*
*Андрэй Вашкевіч, гісторык і краязнаўца.*

Дадатак 1

## ПРАЧЫСЦЕНСКАЯ ЦАРКВА І СВЯТА-РАСТВА-БАГАРОДЗІЦКІ ЖАНОЧЫ ПРАВАСЛАЎНЫ МАНАСТЫР (ПРЫКЛАД ТЭКСТА, ЯКІ МОЖА БЫЦЬ ЗМЕШЧАНЫ НА ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ШЫЛЬДЗЕ)

Прачысценская царква была пабудавана ў XII ст. і з’яўляецца адным з пяці храмаў Гарадзенскай архітэктурнай школы, адметнымі рысамі якой было выкарыстанне ў муроўцы з плінфы ўбудаваных шліфаваных камянёў, а таксама жбаноў-галаснікоў і паліванай пліткі. Царква мела статус Сабornай - галоўнай праваслаўнай царквы горада. Пры царкве дзейнічаў духоўны суд.

Прачысценская царква паўплывала на фарміраванне гэтага раёну горада. За царкоўнымі могілкамі праходзіла другая гарадская лінія ўмацаванняў, а сама царква з’яўлялася часткай абарончай сістэмы горада. На вуліцы каля царквы знаходзіліся пераважна дамы прадстаўнікоў духавенства і шляхты. Пры царкве існаваў шпіталь для ўбогіх, на які былі вылучаны грошы ад польскага караля і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста.

На пачатку XVII ст., у выніку заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі, Прачысценская царква стала грэка-каталіцкай (т.зв. уніяцкай), а ўжо ў 1635 г. пры ёй дзейнічаў жаночы уніяцкі манастыр.

Падчас вайны 1654–1667 гг. Прачысцінская царква была спустошана, але здолела аднавіць сваю дзейнасць. Выпрабаванні часу прывялі да таго, што на пачатку XVIII ст. царква пачала руйнавацца і ў 1720 г. па загаду мітрапаліта Лявона Кішкі яе разабралі. Побач з падмуркамі Прачысцінскай царквы заклалі новую царкву Раства Багародзіцы, якая была пабудавана ў 1726-1751 г. ў стылі барока архітэктарам Іосіфам Фантана.

Пасля скасавання уніі ў 1843 г. царква Раства Багародзіцы і манастыр былі пераўтвораны ў праваслаўныя. Пры гэтым памянялі месцамі ўваход і алтар, так каб месца службы было з усходу, як гэта прынята ў праваслаўнай традыцыі. Таму цяпер тыльны фасад царквы выглядае больш эфектна, чым парадны. У 1860-я гг. з тыльнага боку царквы была прыбудавана т.зв. “Цёплая царква” Сергія Раданежскага (сёння - трапезная), якая мае яркія рысы рускага стыля.

Жаночы манастыр дзейнічаў да 1960 г. У перыяд 1977–1992 гг. у будынках царквы і манастыра знаходзіўся Беларускі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі. У 1992 г. царква і Свята-Раства-Багародзіцкі жаночы праваслаўны манастыр аднавілі сваю дзейнасць.

У парадным двары манастыра ў 1980 г. археолагамі былі выяўлены рэшткі Прачысценскай царквы. Контуры сцен царквы пазначаны пліткай чорнага колеру.

**Тэкст падрыхтаваны Н. Сліж на падставе наступных крыніц і літаратуры:**


Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 128, 1475.

Акты издаваемые Виленскою археографическою комиссиею (далей – АВАК). Т. 1. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1865. АВАК. Т. 7. Акты Гродненского гродского суда. Вильна, 1874. АВАК. Т. 17. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1890. АВАК. Т. 21. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1894.

Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. Гародня–Вроцлаў, 2008.

Карнілава Л. Гродзенскі манастыр базыліянак // ЭГБ. Т. 3. Мінск, 1996. С. 136–137.

Орловский Е. Гродненская старина. Ч. 1. Гродна, 1910.

Сліж Н. З гісторыі Прачысценскай царквы ў Гародні. XVI–XVIII ст. // Гарадзенскі палімпсест XII–XX стст. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гародня, 7 лістапада 2008 г.) / Пад рэдакцыяй А.Ф. Смаленчука і Н.У. Сліж. Гародня; Беласток, 2008. С. 64–95.

Чарняўскі І., Жаровіна Г. Нечаканае адкрыццё // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. Мн., 1982. № 4 . С. 34–36.

Borowik P. Jurydyki miasta Grodna w XV–XVIII wieku. Stanowy podział nieruchomości. Supraśl, 2005.

Jodkowski J. Grodno. Wilno, 1923.

Дадатак 2

## САВЕЦКАЯ ВУЛІЦА (ПРЫКЛАД ТЭКСТА, ЯКІ МОЖА БЫЦЬ ЗМЕШЧАНЫ НА ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ШЫЛЬДЗЕ)

***Гістарычныя назвы: Віленская (15 – 18 ст.), Гімназіяльная (першая трэць XIX ст.), Саборная (1840-я – 1915 гг.), Hinderburg str. (1915 – 1919 гг.), Dominikańska (1919 – 1939 гг.).***

Вуліца была і застаецца адной з галоўных вуліц цэнтральнай часткі горада. Пачала фарміравацца ў XIV стагоддзі разам з пераносам Рынку ў раён сучаснай Савецкай плошчы. Ужо напрыканцы XV ст. тут была даволі шчыльная каменная забудова, якая камбінавалася з фахверкавымі дамамі (адмысловая канструкцыя, пры каторай драўляны каркас будынка запаўняўся муроўкаю).

У сярэдзіне XVI ст. на заходнім баку вуліцы стаяла некалькі дзясяткаў будынкаў гараджан і кляштар Святога Духа са шпіталем (сучасны будынак адміністрацыі Ленінскага раёна г. Гродна, вул. Савецкая, 14). Насупраць кляштара знаходзілася Віленская брама, якая некалі абазначала мяжу гарадской тэрыторыі, і якая з'яўлялася адной з трох брам, праз якія можна было патрапіць у горад. Вуліца выводзіла на Віленскі гасцінец, які з'яўляўся гандлёвым шляхам дзяржаўнага значэння, і таму да канца XVIII ст. яна заставалася важнай гандлёвай артэрыяй горада.

У першай палове XVII ст. на заходнім вулічным баку быў закладзены кляштар дамініканцаў (на месцы сучаснага помніка маршалу Сакалоўскаму).

Сучасны выгляд вуліца пачала набываць пасля пажару 1885 г., які знішчыў амаль усю тагачасную забудову, акрамя некалькіх будынкаў, тры з якіх дайшлі да нашага часу: будынак кляштара Святога Духа, аб якім гаворка была вышэй, будынак гродзенскай мужчынскай гімназіі (вул. Савецкая, 6) і так званы «дом Ромера» (вул. Савецкая, 23). Забудова вуліцы, якая з'явілася пасля пажару, складалася з мураваных дамоў купцоў і прадпрымальнікаў, большасць з якіх дайшла да нашага часу.

У канцы XIX – першай палове XX ст. на вуліцы знаходзілася вялікая колькасць кавярняў, гатэляў, фотамайстэрняў, крамаў і кінатэатараў. На месцы Гандлёвага дома "Нёман" (вул. Савецкая, 18) знаходзіўся самы шыкоўны гатэль горада "Еўропа".

Сення мы можам адчуць подых мінуўшчыны, ступаючы па аўтэнтычным бруку гэтай вуліцы, вырабленым яшчэ ў 1938-1939 гг.

**Тэкст падрыхтаваны А. Вашкевічам на падставе наступных крыніц і літаратуры:**


Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. Гародня–Вроцлаў, 2008.

Гостев А.П., Швед В.В. Кронон. Летопись истории города на Нёмане. Гродно, 1994.

Касатая Т. Кинематограф как часть повседневной городской жизни Гродно в начале XX в. http://harodnia.com/a228.php

Лялевіч Я., Трусаў І., Чарнякевіч А. Ад Каложы да Фартоў. Мінск, 2008.

Орловский Е. Гродненская старина. Ч. 1. Гродна, 1910.

Памятные книжки Гродненской губернии за 1903 и 1912 гг.

Расписание домовъ города Гродны съ указанием числа дворниковъ, должных в нихъ быть. Гродно, 1907.

Borowik P. Jurydyki miasta Grodna w XV–XVIII wieku. Stanowy podział nieruchomości. Supraśl, 2005.

Jodkowski J. Grodno. Wilno, 1923.

Jodkowski J. Gimnazium podominikańskie w Grodnie. Grodno. 1934.

**Прыклады шыльдаў з гістарычнымі назвамі вуліц і даведкамі аб іх гісторыі**




1. Магілёў. Вуліца Ленінская, на якой размешчаны шыльды з гістарычнай назвай вуліцы «Вялікая Садовая»




2. Баранавічы. Вуліца Савецкая, на якой размешчаны шыльды з гістарычнымі назвамі вуліцы ў розныя перыяды часу: Марыінская, Шэптыцкага і інш.




3. Варшава. Шыльда на вуліцы Віні-Пуха.

Дадатак 4

**Прыклады шыльдаў з выявамі гарадской забудовы ў працах знакамітых мастакоў**

1. Варшава. Спецыяльныя кубы з рэпрадукцыямі карцін мастака 18 ст. Бернарда Белота з выявамі тагачаснай Варшавы.





2. Прыклады малюнкаў Напалеона Орды і сучасных відаў г. Гродна з месцаў, дзе можна ўсталяваць шыльды з іх рэпрадукцыямі.







